КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №8 (53)
◂ 30 КРАСАВІКА – 6 МАЯ ◂ 2007 Г.

Новы Час

ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ПАМКНЕННЕ ТЭАФІЛІ САПЕГІ

Стар. 15

УЛАДА — АПАЗІЦЫЯ

Стар. 4–5

ЗА НЕЗАЛЕЖНЫ, АДЗІНЫ І НЕДЗЯЛІМЫ ДАНБАС

З'яўленне на вуліцах Кіева маладых людзей са сцягамі «Данецкай рэспублікі» выклікала на Украіне гучны скандал і рэанімацыю палемікі наконт новай пагрозы данецкага сепаратызму і падзелу Украіны...

Стар. 12

ТУРКМЕНБАШЫ ПАЙШОЎ У ДЫПЛАМАТЫЧНЫ ПРАРЫЎ

Новы туркменскі прэзідэнт здзейсніў свой першы замежны візіт у Саудаўскую Аравію. Выхад Туркменістану са знешняй ізаляцыі пачынае новую вялікую геапалітычную гульню ў Азіі.

Стар. 11

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

А ЯК У ЕЎРОПЕ?

Палітолаг Віктар Чарноў аб механізмах, якія забяспечваюць баланс у структуры улады еўрапейскіх дзяржаў

АД РЭДАКТАРА

З архіва гісторыі: 1 мая 1959 года

ПЕРШАМАЙ

Аляксей КАРОЛЬ

Доўга вагаўся, абіраць ці не дату 1 мая тэмай рэдактарскай калонкі. Неяк не адгукалася ні ў душы, ні ў думках. Пра што пісаць? Нагадаць пра вытокі? Распавесці пра маёўкі часоў барацьбы з самадзяржаўем? Азірнуцца на першамайскія святы савецкага ўзору? Спыніцца на сучаснасці? І тут, на асацыяцыях усплыло слоўца з навуковага лексікону — трансфармацыя. Трансфармацыя (перамена зместу і формы) святкавання даты Першамая ў кантэксце трансфармацыі палітычных сістэм.

1886 год. Пачатак. Героіка адчаю. Забастоўка рабочых у Чыкага. Мітынгі, маніфестацыі. Узброеная паліцыя. Сутыкненні. Стрэлы. Кроў. Забітыя. Не ад добрага жыцця ўзнікаюць сацыяльныя рухі. Тым больш — масавыя.

У 1889 годзе 1 мая рашэннем 1-га (Парыжскага) кангрэсу 2-га Інтэрнацыянала было абвешчана Міжнародным днём салідарнасці працоўных. «Чырвоная зараза» з-за акіяна, з захаду распаўсюджваецца на ўсход, на абсягі Расійскай імперыі. У 1890 годзе Першамай святкуюць рабочыя Варшавы, за імі — Пецярбурга, у 1895 — рабочыя Мінска. У колькасці 40 чалавек на тайным сходзе. Свята — пад забаронай. Свята палітызуецца. Маёўкі на падпольных кватэрах і патаемных лясных палянах трансфармуюцца на ўзлёце рэвалюцыйных хваляў у страйкі і дэманстрацыі. Лозунгі «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жыве дэмакратычная рэспубліка!»

Рэвалюцыі — заўсёды вынік наспелых, але не здзейсненых рэформ. Аднак і рэвалюцыі далёка не заўсёды — прарыў да лепшага жыцця. З 1918 года свята Першамая становіцца афіцыйным дзяржаўным святам «краіны пралетарыяту-пераможцы» — Расіі, Савецкага Саюза. І... пазбаўляецца свайго першаснага сэнсу, пад прыкрыццём славеснага антуражу. Гэта ўжо не трансфармацыя, гэта — падмена. Злавесная. Сацыялізм прыгожай мары трансфармаваўся ў рэальны таталітарызм. Чырвоны, па рэвалюцыйнай легендзе, ад пралітай крыві працоўных, сцяг прамочаны наскрозь крывёю мільёнаў ахвяр сталінскага рэжыму. Расстраляных у падвалах і на патаемных курапацкіх лясных палянах, замучаных у лагерах, памерлых у Галадамор.

А па сталіцах, гарадах і вёсках, уздоўж трыбун — маршам у святочных калонах, з партрэтамі правадыроў у руках — мільёны дэманстрантаў. Яны не ведаць праўды. Яны вераць у светлую будучыню. Яны застрашаныя. Яны хаваюць сумнеў глыбока ў душы. Яны аддаюць даніну афіцыйнай, жорстка кантраляванай завядзёнцы.

Але і не толькі. Нешта светлае ўсё ж было, захавалася і ў тых першамайскіх калонах.

Задумваюся, узгадваю... Бадай, так: з ідэйнай, а лепш сказаць, агульначалавечай першаасновы Першамая, прабіваўся, хаця і моцна аслаблены, імпульс пачуцця салідарнасці. І падмацоўваўся, недзе ў падсвядомасці, адчуваннем еднасці ў агульнай калоне. З перабудовай гэта адчуванне ажыве і матэрыялізуецца ў шматтысячных мітынгах і дэманстрацыях. Не пад прымусам, па закліку душы. А што яшчэ? Ды проста адчуванне вясны, свята, радасці моладзевай студэнцкай тусоўкі, плячо сяброў і позірк прыгажунь... Само жыццё і ўласцівае чалавеку пачуццё салідарнасці супраціўляліся ціску таталітарнага рэжыму, які ўсімі сродкамі імкнуўся раз'яднаць, атамізаваць грамадства.

1886–2007 гады. Героіка адчаю і надзеі. Ці ж не своеасаблівым рэмейкам чыкагскіх падзей глядзяцца сёння карцінкі на нашых телеэкранах: узброеная паліцыя супраць маніфестантаў. Добра, што тэхнічны прагрэс дазволіў замяніць стрэльбы на брандспойты, а прагрэс грамадскі — увесці вулічныя акцыі пратэсту ў прававое поле дазволеных мірных акцый. Чырвоныя тайфунныя рэвалюцыі за стагоддзе трансфармаваліся ў аксамітныя ружовыя.

Цывілізаваны свет урэшце адпрацаваў дэмакратычныя схемы і механізмы своечасовага зняцця канфліктаў, якія выспяваюць. На жаль, не без зрываў. На жаль, не паўсюль.

Праблемная сацыяльная геаграфія — постсавецкая прастора, Беларусь. Абрынуўся СССР, а з ім і свята Першамая савецкага ўзору. Новыя дэмакраты, што вызначылі сябе правымі (прыкладам, БНФ), ад яго прынцыпова адмовіліся. Другія, левыя — камуністы і сацыял-дэмакраты — святкуюць. У іншых (рэмейк першасных) формах — сходы, маёўкі, мітынгі, маніфестацыі. Але з пэўнымі адрозненнямі: камуністы ідуць з кветкамі да помніка Леніну, эсдэкі — да Купалы.

Першы прэзідэнт Беларусі паспрабаваў захаваць савецкую мадэль святкавання 1 мая — адной афіцыйнай калоны перад трыбунай. Але пасля таго, як у гэтую калону два гады запар уклінвалася калона сацыял-дэмакратаў пад бел-чырвона-белымі сцягамі, адмовіўся. Цяпер на правядзенне святочных акцый патрабуецца дазвол уладаў.

Свята, па сутнасці, зноў пад забаронай. І на сцягах левых гістарычна пазнавальны лозунг: «За дэмакратычную рэспубліку!». З цвёрдым удакладненнем — незалежную Беларусь. Святочныя акцыі левых, як і акцыі ўсіх дэмакратычных сіл, — пакуль не шматлікія. Але ў іх ажывае, мацнее стары дух салідарнасці.

Цывілізаваны свет урэшце адпрацаваў дэмакратычныя схемы і механізмы своечасовага зняцця канфліктаў, якія выспяваюць

ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ

НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

ДАСТАЕЎСКІ Ў ДАСТОЕВА

Праўнук вялікага рускага пісьменніка Фёдара Дастаеўскага Дзмітрый Аляксандравіч наведаў вёску Дастоева Іванаўскага раёна, якую яго прадзед пакінуў 350 гадоў таму. У мінулым годзе роду Дастаеўскіх споўнілася 500 гадоў.

ПЕРШЫЯ ГРЫБЫ – ПЕРШЫЯ АТРУЧВАННІ

У Бабруйскім раёне сталі паяўляцца першыя грыбы — страчкі і смарчкі, а медыкамі адразу былі зафіксаваны некалькі атручванняў. Шасцігадовы хлопчык пасля ўжывання грыбоў адчуў сябе кепска і быў змешчаны ў мясцовую лякарню, затым яго перавезлі ў Мінскую дзіцячую інфекцыйную бальніцу. У гэтым жа раёне і з такім жа дыягназам уся сям'я — маці і два сыны — дастаўлены ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы.

ЗДОЛЬНАЯ ВУЧАНІЦА

17-гадовая дзяўчына даведалася ў знаёмага пін-код, скрала ў яго магнітную картку, зняла ў банкамаце болей за 1,5 мільёны рублёў і паспела патраціць семсот тысяч да таго, як яе затрымала міліцыя. Маці грошы вярнула, аднак крымінальная справа ўзбуджана.

МАЛАДЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ НЕ ПРАЦУЮЦЬ

Паводле іскаў пракураў Брэсцкай вобласці, больш за 315 мільёнаў рублёў павінны сплаціць маладыя спецыялісты, якія па размеркаванні не адпрацавалі вызначаны заканадаўствам час.

БРАКАНЬЕР У ПАМЕЖНАЙ ЗОНЕ

Памежнікі Лідскага атрада затрымалі парушальніка рэжыму дзяржаўнай мяжы. Грамадзянін Беларусі К. займаўся тут незаконным ловам рыбы. У браканьера былі адабраны дзве 30-метровыя сеткі і яшчэ 12 падобных выяўлена ў возеры. Затрыманы разам з сеткамі перададзены інспектарам Дзяржаўнай інспекцыі па ахове жывёльнага і расліннага свету.

НЕБЯСПЕЧНАЯ ЗНАХОДКА

Чацвёра школьнікаў з пасёлка Дзісна Міёрскага раёна ў нежылым доме адшукалі колбу з 800-мі грамамі ртуці. Частку невядомага ім рэчыва яны разлілі, затым спужаліся і разбегліся. Дома адзін з хлопчыкаў расказаў пра знаходку бацькам, тыя звярнуліся ў аддзяленне МНС. Медыкі абследавалі дзяцей, а спецыялісты ачысцілі мясцовасць.

ЛІКВІДАТАРЫ

НОВАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

Вячаслаў КУЛІК

Арганізацыйны камітэт у справе стварэння грамадскага аб'яднання «Ліквідатар» абвясціў, што ўстаноўчая канферэнцыя арганізацыі адбудзецца ў Мінску 19 мая.

Ва ўсіх рэгіёнах краіны пачалі дзейнічаць ініцыятыўныя групы, а ў спісе патэнцыйных сяброў аб'яднання — амаль тысяча ўдзельнікаў ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Стваральнікі таварыства «Ліквідатар» мелі намер правесці сваю канферэнцыю 27 мая. Але перанеслі на тыдзень раней, бо 27-га адбудзецца Кангрэс дэмакратычных сіл, як патлумачыў старшыня аргкамітэта Аляксандр Валчанін.

У Віцебску ініцыятыўную групу ўзначальвае сябра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоль Гнеўка. Ён — палкоўнік запасу. Прыгадвае, што ў 1986 годзе падраздзяленні штабу Грамадзянскай абароны камплектаваліся рэзервістамі, і праз іх прайшлі больш як 300 тысяч чалавек. Анатоль Гнеўка лічыць, што ліквідатары мусяць ствараць сваю арганізацыю для сацыяльнай абароны.

Тым часам, у Палаце прадстаўнікоў разглядаецца законапраект, які можа адмяніць для ліквідатараў існуючыя ільготы. У прыватнасці, прадугледжваецца скасаваць бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне і дадатковы адпачынак.

Пратэст гэтаму ліквідатары рыхтуюць заявіць на Чарнобыльскім шляху. Па словах сябра ініцыятыўнай групы Рыгора Корбута, ліквідатары збіраюцца 26 красавіка на мітынг, а пасля — у парламент і да прэзідэнта. «Час ужо. 21 год нас вадзілі за нос. Мы ж не падлеткі. З палка тысячу чалавек ужо пахаваныя...» — кажа Рыгор Корбут.

У Чарнобыльскім шляху ліквідатары будуць удзельнічаць асобнай калонай.

КАМУНАЛЬНІКІ

БАРАЦЬБА З АНТЭНАМІ

Міхал КАРНЕВІЧ

На пад'ездах лідскіх шматпавярховак з'явіліся аб'явы, на якіх камунальныя службы патрабуюць прыбраць антэны спадарожнікавага тэлебачання. У Лідскай жыллёва-камунальнай гаспадарцы сцвярджаюць, што антэны парушаюць правілы эксплуатацыі жылых дамоў.

Жыхар аднаго з мікрараёнаў Ліды Сяргей Коваль згадвае, што патрабаванні зняць спадарожнікавыя антэны прагучалі год таму. Гэта было якраз напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, але пазней справа быццам заціхла. І вось раптам зноў пачаліся тэлефанаванні з ЖЭСу да ўладальнікаў «талерак».

«Зноў патэлефанавалі з ЖЭСу і запрасілі прыйсці, каб зрабіць мне папярэджанне, а калі і пасля гэтага я не здыму антэну, мяне аштрафуюць на 15 базавых велічынь, што каля 700 долараў», — распавёў Сяргей Коваль.

У лідскім ЖЭСе №3 ведаюць пра гэтую праблему. Старэйшы майстар Тэрэза Лазоўская спасылаецца на загад, які прыйшоў з абласной жыллёва-камунальнай гаспадаркі, а таксама на інструкцыю Лідскай ЖКГ. Згодна з ёй, забараняецца выкарыстоўваць прыватныя спадарожнікавыя антэны.

На тэрыторыі ЖЭСу №3 знаходзіцца каля двухсот прыватных спадарожнікавых антэн. Выканаўца абавязкаў начальніка ЖЭСу спадар Аршанскі кажа, што загаду зверху давядзецца падпарадкавацца: «Адразу папярэджваем, потым вывешваем аб'яву, калі людзі не здымуць, будзем мы здымаць».

Намеснік старшыні Лідскай жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віктар Вайтулевіч зазначыў, што падобныя антэны забаронена замацоўваць на дамах без дазволу. Гэтае правіла яшчэ 1990 году, але ўжо семнаццаць гадоў гаспадарчыя службы не звярталі на яго ўвагі.

Да ўсяго, спадар Вайтулевіч лічыць, што антэны псуюць выгляд вуліцаў, дый не разумее — навошта людзям прыватныя антэны, калі ва ўсім горадзе ёсць кабельнае тэлебачанне і там можна пабачыць да трыццаці праграмаў.

Уласнік прыватнай спадарожнікавай антэны Сяргей Коваль лічыць, што такім чынам улады спрабуюць абмежаваць права на атрыманне інфармацыі. Усе тэлеканалы, якія транслюе дзяржаўная фірма «Гарант», знаходзяцца пад кантролем. Сяргей нават збіраецца судзіцца з мясцовымі камунальнікамі: «Хацеў бы стварыць прэцэдэнт, і калі б дазвалялі сродкі наняць адваката, можна было б падаць іск на камунальнікаў. Лічу, што яго можна было б выйграць у судзе».

ЮБІЛЕЙ

ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ «ГАЗЕЦЕ СЛОНІМСКАЙ»

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Недзяржаўнаму штотыднёвіку «Газеце Слонімскай» споўнілася 10 год. Але шырока адзначаць юбілей калектыў недзяржаўнага тыднёвіка не збіраецца. Паводле галоўнага рэдактара Віктара Валадашчука, час для выдання недзяржаўных рэгіянальных газет цяпер у Беларусі не найлепшы.

24 красавіка 1997 года выйшаў першы нумар аднаўленай «Газеты Слонімскай». Газета з такой жа назвай, але на польскай мове, была заснаваная ў Слоніме ў снежні 1938 года беларускім паэтам Сяргеем Новікам-Пеюном і яго жонкай Людмілай. Але неўзабаве выданне было ліквідавана польскімі ўладамі паводле палітычных матываў. Праз 58 гадоў газету аднавіў журналіст Віктар Валадашчук: «Мы вырашылі ўзяць гэтую спадчыну, назву-брэнд, і такім чынам яна і пачала выходзіць. Першы нумар газеты быў зусім тонкі, з невялікім накладам у тры тысячы. За 10 гадоў было ўсё: газета пакрысе таўсцела, павялічваўся наклад. Былі праблемы і з кадрамі, і з памяшканнем, і з перарэгістрацыяй», — гаворыць галоўны рэдактар.

Цяпер «Газета Слонімская» выходзіць на 40 палосах, накладам ад 7 да 8 тысяч асобнікаў і распаўсюджваецца ў Слонімскім, Дзятлаўскім, Зэльвенскім, Мастоўскім і Ваўкавыскім раёнах Гродзеншчыны. Як многія іншыя недзяржаўныя выданні, «Газету Слонімскую» не распаўсюджваюць «Белпошта» і »Белсаюздрук». Рэдакцыя стварыла ўласную сістэму распаўсюду. Віктар Валадашчук гаворыць, што будучыня газеты абсалютна няпэўная: «На сённяшні час гаварыць пра нейкія перспектывы, будаваць нейкія бізнес-планы і разлічваць на нешта вельмі цяжка. Мы з калегамі часта гаворым на гэтыя тэмы. Дзякуй Богу, што газеты выходзяць — і гэта добра».

Галоўны рэдактар «Газеты Слонімскай» гаворыць, што 10-гадовы юбілей калектыў адзначыць, але вельмі сціпла.

ПАЛІТЫКА

ТАЦЦЯНУ СЕВЯРЫНЕЦ ЗВОЛЬНІЛІ

Маці вядомага палітыка Паўла Севярынца, настаўніца рускай мовы сярэдняй школы № 40, атрымала загад пра звальненне.

Згодна з ім, Таццяну звальняюць нібыта за парушэнне працоўнай дысцыпліны — за прагулы шасці працоўных дзён. Яна рыхтуецца абскардзіць гэты загад у судзе і запатрабаваць ад раённага аддзела адукацыі кампенсацыі ўласных маральных і матэрыяльных стратаў.

Звальненне Таццяны Севярынец лічыць незаконным і абумоўленым перадусім палітычнымі прычынамі: «Я атрымала загад, так што 27 красавіка ў мяне апошні дзень, а з 28-га — я ўжо беспрацоўная. На загадзе я напісала, што з ім не згодная. А потым быў бацькоўскі сход, і першае пытанне да мяне было такое: «Таццяна Яўгенаўна, гэта за палітыку?» Я сказала: «Так, гэта таксама прычына майго звальнення. Хаця ў загадзе прычына пададзена іншая».

Загад пра звальненне настаўніцы вышэйшай катэгорыі з амаль 36-гадовым стажам падпісаў начальнік аддзела адукацыі Першамайскага раёна Уладзімір Шлома. Бацькі вучняў 5 «А» класа сярэдняй школы № 40 вырашылі бараніць класную кіраўніцу сваіх дзяцей. Яны напісалі зварот на яго імя ў раённую адміністрацыю.

Як распавяла маці аднаго з вучняў, у калектыўным лісце яны палітыку не краналі, і прасілі начальніка раённага аддзела адукацыі прыняць да ўвагі перадусім высокія прафесійныя якасці Таццяны Севярынец.

Зварот у аддзел адукацыі падпісалі бацькі амаль усіх вучняў 5 «А» класа: 24 з 27-мі. Асобны ліст напісалі самі пяцікласнікі, ён пачынаецца словамі: «Калі ласка, не звальняйце нашу класную кіраўніцу Севярынец Таццяну Яўгенаўну, якая стала нам як маці, а мы — яе дзеці».

Падставай для звальнення Таццяны Севярынец стала тое, што яна нібыта прапусціла шэсць працоўных дзён падчас вясновых вакацыяў, калі ездзіла да дачкі ў Мінск і на семінар у Варшаву. Начальнік райаддзела адукацыі Уладзімір Шлома, які спачатку дазволіў ёй адпачынак за ўласны кошт з 26-га па 31-га сакавіка, у апошні момант адмяніў уласнае рашэнне. Пра гэта Таццяне Севярынец паведамілі па тэлефоне, пісьмовай адмовы яна не бачыла дагэтуль.

Спадарыня Севярынец рыхтуе заяву ў суд супраць начальніка аддзела адукацыі. Таксама яна напісала скаргу ў пракуратуру на дырэктара школы № 40 Юрыя Лаўрэнава — той не дазволіў ёй зняць копіі са Статута школы і іншых дакументаў, якімі рэгулюецца працоўная дзейнасць настаўнікаў, каб з імі маглі пазнаёміцца юрысты і адвакат Таццяны Севярынец.

ЖАЛОБА

«ЕЛЬЦЫН БЫЎ ГІСТАРЫЧНАЙ ФІГУРАЙ»

У панядзелак, 23 сакавіка, у Маскве на 77-м годзе жыцця памёр першы прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын. Прычынай яго смерці з'явілася «прагрэсуючая сардэчна-сасудзістая поліарганная недастатковасць».

У сувязі са смерцю Б.Ельцына, 25 красавіка было абвешчана ў Расіі днём жалобы. Пахаваны першы прэзідэнт Расіі на Новадзявочых могілках у Маскве.

Па інфармацыі газеты «Камерсант», у апошнія дні жыцця Барыс Ельцын знаходзіўся ў Цэнтральнай клінічнай бальніцы і амаль не ўставаў з ложка. Увесь тыдзень у яго балела сэрца, а рэзкае пагаршэнне стану здароўя адбылося ў апошнія тры дні.

У панядзелак раніцай наглядалася невялікае паляпшэнне, а потым двойчы спынялася сэрца. У першы раз дактары здолелі вярнуць пацыента да жыцця, але ў другі зрабіць ужо нічога не змаглі.

Уладзімір Пуцін з нагоды смерці першага прэзідэнта Расіі выступіў з тэлевізійным зваротам, у якім адзначыў вялікую ролю Барыса Ельцына ў пераходзе Расіі да дэмакратыі і выказаў спачуванне яго родным і блізкім.

Барыс Ельцын двойчы абіраўся прэзідэнтам РФ — у 1991 і 1996 гадах. Ён быў адным з ініцыятараў ліквідацыі Савецкага Саюза. У 1999 годзе, яшчэ да заканчэння прэзідэнцкага тэрміну, добраахвотна перадаў прэзідэнцкія паўнамоцтвы свайму пераемніку Уладзіміру Пуціну.

Барыс Ельцын нарадзіўся 1 лютага 1931 года ў вёсцы Бутка Таліцкага раёна Свярдлоўскай вобласці. У 1955 годзе скончыў будаўнічы факультэт Уральскага політэхнічнага інстытута імя Кірава. Пасля працаваў па спецыяльнасці: ад майстра да начальніка Свярдлоўскага домабудаўнічага камбіната. У 1961 годзе быў запрошаны на партыйную працу. У 1975 годзе прызначаны сакратаром, а 1976-м — першым сакратаром Свярдлоўскага абкама КПСС.

Першы прэзідэнт Расіі выдаў тры кнігі: «Споведзь на зададзеную тэму (1991), «Нататкі прэзідэнта» (1994) і «Прэзідэнцкі марафон» (2000).

Асобу першага прэзідэнта расійскай Федэрацыі высока ацэньваюць ва ўсім свеце, і большасць сусветных лідэраў адгукнулася на гэту жалобную падзею.

Прэзідэнт ЗША Джордж Буш з нагоды смерці Барыса Ельцына выступіў з адмысловай заявай: «Лора і я глыбока засмучаныя смерцю былога расійскага прэзідэнта Барыса Ельцына. Прэзідэнт Ельцын быў гістарычнай фігурай у часе імклівых пераменаў. Ён адыграў ключавую ролю ў развале Савецкага Саюза, дапамог закласці падмурак свабоды ў Расіі і стаў першым дэмакратычна абраным лідэрам гэтай краіны. Я высока ацэньваю ягоныя высілкі, скіраваныя на ўмацаванне адносінаў паміж Расіяй і ЗША».

Кіраўнік знешняй палітыкі Еўрасаюзу Хаўер Салана таксама адзначыў вялікую ролю Ельцына ў гісторыі наладжвання адносінаў паміж Расіяй і Захадам.

Старшыня Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы Рэнэ ван дэр Ліндэн заявіў, што «для Рады Еўропы Барыс Ельцын назаўсёды застанецца чалавекам, які прывёў Расійскую Федэрацыю ў сям'ю еўрапейскіх народаў», і нагадаў, што ў часе кіравання Ельцына ў Расіі быў уведзены мараторый на смяротнае пакаранне.

Былы прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук, які разам з Ельцынам і Шушкевічам падпісваў Белавежскія пагадненні, заявіў: «Для мяне асабіста гэта быў маштабны чалавек, які пад выглядам строгай знешнасці сапраўды хацеў, каб людзі жылі дэмакратычна. І для дэмакратыі ў Расіі, для яе пачаткаў (а трэба ведаць спецыфіку і асаблівасці Расіі, каб зразумець мае словы) Ельцын зрабіў вельмі шмат. Ён праклаў першую баразну дэмакратычнага, свабоднага развіцця Расіі пасля таталітарнай сістэмы».

Заслугі Ельцына для дэмакратыі ў Расеі адзначыў колішні ягоны саюзнік і аднадумца, былы прэзідэнт Грузіі Эдуард Шэварднадзэ. Прадстаўнікі былых савецкіх рэспублік падкрэсліваюць той факт, што, пры ўсіх сваіх супярэчнасцях, менавіта Ельцын праклаў шлях да незалежнасці гэтых рэспублік. Вось што сказаў былы прэзідэнт Малдовы Пэтру Лучынскі: «Ён адыграў ключавую ролю ў з'яўленні такіх маладых краінаў, як Малдова. Ён прысвячаў шмат увагі нацыянальным памкненням краін савецкага кангламерату, і ён заўсёды быў чулым у гэтых пытаннях».

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

У адзін кошык

Сяргей САЛАЎЁЎ

Бачна, што прэсавая канферэнцыя для беларускіх журналістаў станоўча паўплывала на беларускага прэзідэнта. На тыдні Аляксандр Лукашэнка чарговы раз выступіў — гэтым разам перад дэпутатамі.

Незразумела, канешне, які сэнс быў выступаць перад Саветам Рэспублікі, якіх прызначае сам беларускі прэзідэнт, але ж… У любым выпадку, мы даведаліся шмат чаго новага.

Адна з найбольш актуальных прамоў — прэзідэнт не хоча, каб мы залежалі ад Расіі. У прыватнасці, у пабудове атамнай станцыі на Беларусі.

Міжнародны конкурс на права будаўніцтва ў Беларусі атамнай электрастанцыі будзе адкрытым. «Гэтае пытанне ў кулуарах вырашацца не будзе», — заявіў Аляксандр Лукашэнка, выступаючы 24 красавіка са штогадовым пасланнем да беларускага народа і парламента.

«Вядома, нам не хацелася б, — я ўжо паслу Расіі пра гэта казаў, — каб мы складалі яйкі ў адзін кошык. Мы залежныя і так па іншых відах энергіі ад Расіі, не хацелася б залежаць і ў будаўніцтве атамнай станцыі толькі ад Расійскай Федэрацыі, — сказаў беларускі прэзідэнт. — Мы хацелі б, каб атамную станцыю пабудавалі, можа быць, іншыя, але прыярытэт будзе аддадзены выключна цане і якасці. Для нас, калі конкурс гэты выйграе Расія, — я таксама паслу пра гэта казаў, — як бы нам гэта ні не падабалася, што зноў гэтае яйка трапіць у адзін кошык, гэта будзе бяспечная станцыя, і Расія нам яшчэ і крэдыт прапаноўвае пад гэтую станцыю. Вядома, мы будзем будаваць яе з Расіяй. І калі там сістэмы кіравання сёння больш слабыя, чым у «Сіменса», дапусцім, то мы гэтыя сістэмы купім у «Сіменса». Калі сёння ядзерны рэактар лепш за Расію ніхто не можа стварыць, то мы будзем гэта рабіць з Расійскай Федэрацыяй».

У сувязі з гэтым узнікае пытанне: а ці ведае Аляксандр Лукашэнка, у якім стане знаходзіцца расійская атамная энергетыка? Колькі за апошнія год дваццаць пабудавана рэактараў у Расіі? Адказ адзіны — ніводнага. Расійская атамная энергетыка — у заняпадзе. І гэта прызнаюць самі расійскія атамшчыкі.

Лукашэнку супярэчыць прафесар Іван Нікітчанка. Па ягоных словах, «на сённяшні дзень для будаўніцтва атамнай станцыі ў Беларусі няма ні тэхнічнага абгрунтавання, ні грамадскага абмеркавання — няма нічога».

Ён таксама паведаміў, што, паводле яго звестак, Францыя адмовілася ад планаў будаўніцтва беларускай АЭС. «Расія ж заявіла, што яна дасць крэдыт на будаўніцтва атамнай станцыі. Але крэдыт — гэта толькі крэдыт, і потым за яго трэба расплачвацца», — зазначыў І. Нікітчанка.

Паводле слоў вучонага, «трэба 10 гадоў рыхтавацца, каб пабудаваць атамную станцыю». «Толькі для абслугоўвання АЭС патрэбны 400 спецыялістаў, якіх трэба вучыць не адзін год. А ўвогуле, і Чарнобыль узарвалі менавіта такія ж ненавучаныя «спецыялісты», якія ёсць цяпер у нас», — сказаў прафесар.

На яго думку, за кошт эканоміі і аднаўляемых крыніцаў энергіі (сонечныя батарэі, ветраныя ўстаноўкі, гідраэлектрастанцыі і ўстаноўкі для атрымання біяпаліва) толькі ў сельскай гаспадарцы Беларусь можа зэканоміць 20 працэнтаў электраэнергіі.

Але атамнай станцыяй прэзідэнт не абмежаваўся. І тут — таксама, пэўна, уплыў на прэзідэнта прэс-канферэнцыі з беларускімі СМІ.

Дзяржава акажа падтрымку апазіцыйным сродкам масавай інфармацыі пры ўмове, што яны будуць выконваць дзейнае заканадаўства. Такую заяву зрабіў Лукашэнка, адказваючы 24 красавіка на пытанні журналістаў пасля сумеснага пасяджэння Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

Прэзідэнт зазначыў, што існуе закон, пэўныя патрабаванні, згодна з якімі публікавацца павінен праверены матэрыял. Апазіцыйныя СМІ, лічыць ён, несправядліва ацэньваюць палітыку, што праводзіцца ў краіне, працу дэпутатаў.

«Я гатовы даць адпаведную каманду, але калі будзе размешчаны заведама непраўдзівы матэрыял, то больш на тэрыторыі Беларусі гэтае выданне выходзіць не будзе», — заявіў прэзідэнт.

Здаецца мне, пытанні пра выхад або нявыхад выдання павінна вырашаць рэдакцыя. Або — суд. Або — Міністэрства інфармацыі, згодна са сваімі паўнамоцтвамі. Але каб прэзідэнт персанальна ацэньваў журналісцкія матэрыялы як заведама праўдзівыя або заведама непраўдзівыя… Гэтак ён круглыя суткі толькі і павінен рабіць, што прэсу чытаць. Яму што, больш няма чым заняцца?

Патрабаванні да беларускага народа ўзрастаюць. «Беларусам трэба мабілізавацца, каб стаць нацыяй працаголікаў», — заявіў Лукашэнка. Паводле яго слоў, «прынцып поспеху просты: трэба лепш працаваць». Настаў час, калі кожны мае магчымасць жыць нармальна, пракарміць сябе і сваю сям'ю, лічыць прэзідэнт. «Пераважная большасць беларусаў гэта зразумелі і працуюць з дня ў дзень. Трэба і астатнім гэта зразумець», — сказаў ён.

«Працагалізм» ва ўсім свеце ўжо прызнаны сур'ёзнай хваробай. І я, прыкладам, рады б выканаць даручэнне прэзідэнта: абедзвюма рукамі «за»! Але ж ёсць пэўная нестыковачка. Я не «крыху вышэй Бога», а таму не ў маіх мажлівасцях зрабіць у сутках замест 24 гадзін 30. А лепш — 37. Шкада, канешне, але ж проста не здольны я на такое.

Карацей, мы на тыдні паслухалі шмат чаго такога, што можна выдаць за пажаданае. А рэальна… Рэальна ад гэтай прамовы нічога не змянілася.

ЭКСПЕРТЫЗА

УЛАДА — АПАЗІЦЫЯ

Андрэй ЛЯХОВІЧ, палітолаг

Міхаіл Фрадкоў і Сяргей Сідорскі

«Мы — яны»

А.Р. Лукашэнка плануе быць пажыццёвым прэзідэнтам. На бліжэйшую перспектыву (2007 год) вакол яго асобы адбылася кансалідацыя кіроўнай эліты і забяспечана поўная лаяльнасць дзяржаўных службоўцаў. Ён мае да сваіх паслуг дзяржаўны апарат, які выконвае яго волю, у тым ліку і сілавыя структуры. Супрацоўнікі гэтых структур, як і большасць іншых дзяржаўных службоўцаў, кажуць пра апазіцыю ў катэгорыях «мы — яны».

Нафтагазавы канфлікт з Расіяй у канцы 2006 года быў, галоўным чынам, інфармацыйнай падзеяй. Афіцыйна абвешчаныя кошты, па якіх Беларусь купляе расійскія газ і нафту, не адпавядаюць сапраўднасці. Як і меркавалася, бакі перайшлі на «ценявыя схемы» аплаты за энерганосьбіты.

Кансалідацыю ўлады, электаральныя пазіцыі А.Р. Лукашэнка ўзмацняе ціск з боку Расіі. Ён выступае ў якасці абаронцы інтарэсаў прадстаўнікоў улады і грамадства ў цэлым.

З аднаго боку, канфлікт стымуляваў жаданне Лукашэнкі паказаць сябе ў ролі паслядоўнага абаронцы незалежнасці, суверэнітэту Беларусі, абаронцы беларусаў ад расійскіх алігархаў. З другога боку — шырокая інфармацыйная кампанія дзяржаўных СМІ, мэтанакіраваная праца «ідэалагічнай вертыкалі», створанай на прадпрыемствах, установах, арганізацыях, была накіравана на ўзмацненне настрояў у падтрымку незалежнасці Беларусі. Беларускае грамадства было падрыхтавана, калі паўстане неабходнасць, вытрымаць інтэнсіўны ціск, энергетычны шантаж з боку Расіі.

Да нафтагазавага канфлікту ў снежні 2006 года, паводле інфармацыі незалежных сацыёлагаў, уваходжанне Беларусі ў склад Расіі падтрымлівалі 12–13 працэнтаў беларускіх выбарцаў. Пасля Новага году — 3–4 працэнта. Гэта больш чым у два разы менш за колькасць этнічных рускіх у складзе насельніцтва Беларусі.

Тэхнакраты

Разам з тым у структурах улады ўзмацняюцца палітычныя пазіцыі групы эканамічных рэфарматараў, кіраўнікоў — гэта значыць, тэхнакратаў, якія на працягу апошніх гадоў дастаткова паспяхова вырашалі задачы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў межах мадэлі, якую ўсталяваў Лукашэнка. Захаванне станоўчай дынамікі развіцця сацыяльна-эканамічнай сітуацыі (галоўная ўмова палітычнай стабільнасці) стала яшчэ ў большай ступені залежыць, па-першае, ад кампетэнтнасці тэхнакратаў (асобаў, што кіруюць галінамі эканомікі, прадпрыемствамі). Па-другое, ад магчымасці тэхнакратаў больш самастойна дзейнічаць, не баючыся празмернага ўмяшання чыноўнікаў і групаў, што не маюць вопыту кіравання эканомікай, — іншымі словамі адміністратараў, палітычных кіраўнікоў, сілавікоў.

У новых умовах Лукашэнка вымушаны даць большую свабоду тэхнакратам у кіраванні эканамічнымі працэсамі.

Узмацненне ўплыву тэхнакратаў звязана з іх роляй у фармаванні новай, гэта значыць больш «рынкавай», сістэмы адносін з Расіяй, у максімальна магчымай ступені, якая б адпавядала беларускім інтарэсам.

Неабходнасць увядзення жорсткага дыялогу з Расіяй з мэтай выгандлеваць найбольш спрыяльныя ўмовы, мінімізаваць эканамічныя выдаткі абумовіла ўзмацненне ўплыву ў асяроддзі Лукашэнкі асобаў, кампетэнтных у пытаннях эканомікі — лідэраў тэхнакратаў — прэм'ер-міністра С. Сідорскага і першага віцэ-прэм'ера В. Сямашкі.

Сярод прадстаўнікоў эканамічнай і адміністратыўнай эліты дастаткова распаўсюджана меркаванне, што лідэры тэхнакратаў — С. Сідорскі і В. Сямашка — з'яўляюцца прадстаўнікамі групы, здольнай эфектыўна кіраваць краінай. Падставы для такога меркавання наступныя. Па-першае, лідэры тэхнакратаў з'яўляюцца дастаткова паспяховымі эканамічнымі менеджэрамі. У тым ліку з іх дзейнасцю звязваюць эканамічны рост, які назіраўся з 2004 года. Па-другое, у іх асобах бачаць палітыкаў, якія здольны адстойваць беларускія інтарэсы (эканамічныя, палітычныя) у адносінах з Расіяй. Сярод прадстаўнікоў улады і незалежных экспертаў-эканамістаў С. Сідорскага і В. Сямашку называюць «эканамічнымі нацыяналістамі». У іх бачаць палітыкаў, якія не пускаюць і не пусцяць у Беларусь расійскія кампаніі, расійскіх алігархаў, расійскі крымінальны бізнес. Па-трэцяе, С. Сідорскі валодае здольнасцямі публічнага палітыка. Па-чацвёртае, прадстаўнікі эканамічнай і адміністратыўнай эліты, калі разважаюць на тэму «калі Лукашэнка не зможа выконваць паўнамоцтвы прэзідэнта, хто будзе лепшым кандыдатам на гэты пасаду?» робяць выбар на карысць лідэра тэхнакратаў С. Сідорскага на кантрасце з апазіцыйнымі палітыкамі.

Хто за каго

У беларускам грамадстве, асабліва ў яго інтэлектуальнай, высокаадукаванай, высокакваліфікаванай частцы, апошнім часам узмацняюцца настроі расчаравання ў апазіцыі. Апазіцыйныя палітыкі, перадусім лідэры партый, не асацыююцца з дэмакратычным развіццём Беларусі нават сярод выбарцаў — прыхільнікаў дэмакратычных перамен.

Адна з прычын такой сітуацыі — тое, што на працягу доўгага часу апазіцыя дасылала грамадству сігналы, што яна абсалютна не гатовая кіраваць дзяржавай, што яна цалкам не здольная вырашаць складаныя задачы на дзяржаўным узроўні. Апазіцыя або відавочна палохала выбарцаў, калі займала непапулярную пазіцыю, як гэта было ў першай палове 2004 года ў святле «газавага» канфлікту Беларусі і Расіі. Або распаўсюджвала інфармацыйныя матэрыялы з гучнай назвай «праекты рэформ», якія ўражвалі спецыялістаў відавочнай неадпаведнасцю назвы і зместу.

Лукашэнка і сілавікі добра інфармаваныя пра такія адносіны да апазіцыі сярод эканамічнай і адміністратыўнай эліты. Цудоўна разумеюць, што альтэрнатыву Лукашэнку значная колькасць незадаволеных ім у гэтым асяроддзі бачыць не сярод апазіцыі, і не сярод былых службовых асобаў, а сярод цяперашніх высокіх чыноўнікаў, кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў. Пра гэта сведчыць разгром груп у складзе эканамічнай эліты ў 2001–2002. гадах.

Можна сказаць, што адбываецца кансалідацыя тэхнакратаў. Разам з тым, варта адзначыць, што калі дзякуючы працы цяперашняй групы тэхнакратаў будуць створаны дастатковыя перадумовы для ўстойлівага развіцця эканомікі, ёсць вялікая верагоднасць, што Лукашэнка зноў запусціць махавік антыкарупцыйнай кампаніі, і /або адбудзецца маштабная ратацыя службоўцаў. Сучасныя прадстаўнікі групы тэхнакратаў і іх лідэры будуць заменены на новыя фігуры.

Першай прыкметай развіцця падзей па такому варыянту будзе, напрыклад, паніжэнне ў статусе, пасадзе У. Сямашкі (зараз першы віцэ-прэм'ер), і прызначэнне першым віцэ-прэм'ерам А. Кабякова (зараз віцэ-прэм'ер).

Усведамленне тэхнакратамі сітуацыі ў Беларусі і перспектыў яе развіцця спрыяюць у цэлым перспектывам дэмакратызацыі. Зараз Лукашэнка больш задавальняе тэхнакратаў, чым апазіцыя ў яе сучасным інстытуцыянальным і функцыянальным стане. Ён больш зразумелы і прадказальны. На працягу другой паловы 2005–2006 гадоў фармат адносін Лукашэнка і тэхнакратаў змяніўся ў спрыяльны ім бок.

У тым выпадку, калі Лукашэнка будзе здольны выконваць прэзідэнцкія паўнамоцтвы, існуе дастаткова высокая верагоднасць выступлення тэхнакратаў, каб абараніць свае палітычныя пазіцыі і займець новыя.

Апазіцыя

У гэты час апазіцыя перажывае інстытуцыянальны крызіс. Мы маем на ўвазе тры параметры яе стану: апазіцыйныя арганізацыі маюць невялікую колькасць сяброў; існуе раскол у адносінах паміж апазіцыйнымі партыямі; існуе раскол і ў межах апазіцыйных партый.

Калі мы кажам «аб'яднаныя дэмакратычныя сілы», маем на ўвазе наяўнасць арганізаваных груп, якія маюць дастатковы для аказання ціску на ўладу патэнцыял — гэта значыць, дастаткова масавых. Аднак на гэты момант апазіцыйныя арганізацыі згубілі свой патэнцыял. Іх можна параўнаць з «пустой пасудзінай»: ёсць форма — кіраўнікі, устаноўчыя дакументы, праграмы. Але вельмі мала людзей. Яны сталі статыстамі таго, што адбываецца на Беларусі.

Ва ўмовах неспрыяльнай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі апазіцыйныя арганізацыі былі здольныя прыцягнуць дастаткова значную колькасць людзей для ўдзелу ў акцыях пратэсту, для правядзення выбарчай кампаніі канкурэнтаў Лукашэнкі ў 2001 годзе. Арыентаваныя на вулічную актыўнасць, яны не здолелі перабудаваць сваю дзейнасць ва ўмовах, калі сталі патрэбныя не толькі лозунгі, заклікі, налепкі, графіці, а пастаянная напружаная праца з выбарцамі, пастаянная камунікацыя з людзмі на фоне актуальных праблемаў палітыкі, сацыяльнай сферы, эканомікі. Лукашэнка змог стаць больш рацыянальным, зразумелым выбарцам, яго апаненты — не.

Зараз у жорсткім крызісе палітычнага жанру знаходзяцца палітычныя партыі. Іх старыя метады працы з электаратам выклікаюць раздражненне сярод большасці выбарцаў, для якіх істотнымі з'яўляюцца «хлебныя», г. зн. сацыяльна-эканамічныя пытанні. Горкае расчараванне адчуваюць выбарцы — прыхільнікі дэмакратычнага шляху развіцця Беларусі (каля 20 працэнтаў ад агульнай колькасці выбарцаў). Для гэтай, больш інтэлектуальнай, адукаванай часткі беларусаў відавочныя «цяжкія дзіцячыя хваробы» палітычных партый, якія ўпарта не хочуць рабіцца дарослымі, адстаюць у сваім развіцці ад грамадства, неадэкватна рэагуюць на тое, што адбываецца ў краіне.

У выніку, пасля таго, як цікавасць выбарцаў да дзейнасці палітычных партый упала і значная колькасць актывістаў пасля прэзідэнцкіх выбараў 2001 года сышла, палітычныя партыі сталі палітычнымі клубамі, маргінальнымі групоўкамі. Зараз у дзейнасці партый бярэ ўдзел адна дзесятая частка іх спісачнага складу. У Мінску, дзе самыя буйныя апазіцыйныя партыі — ПБНФ, ОГП, БСДП (Грамада) — маюць па спісах прыкладна па 1000 сяброў кожная, удзел у дзейнасці бяруць не больш за 100 чалавек. У абласных цэнтрах (гарадах з насельніцтвам больш за 300 тысяч чалавек), дзе партыйныя арганізацыі налічваюць па спісах больш 300 чалавек, удзельнічаюць у дзейнасці не больш за 50. Менш спрыяльныя суадносіны ў Мінску тлумачацца тым, што ў сталіцы дзейнасць партый вызначаюць прадстаўнікі цэнтральнага кіраўніцтва, якія карыстаюцца меншым, чым рэгіянальныя лідэры, даверам сяброў партый.

За выключэннем ПБНФ, ОГП, БСДП (Грамада), ПКБ, якія з'яўляюцца партыямі хаця б па спісах сяброў і наяўнасці рэгіянальных структураў, Партыі свабоды і прагрэсу, якая расце, у партыйнай сістэме Беларусі прысутнічаюць арганізацыі-фантомы. Менавіта на іх фоне, а не праз свой патэнцыял ПБНФ, ОГП, БСДП (Грамада), ПКБ з'яўляюцца буйнымі партыямі.

Перыядычнае з'яўленне ў інфармацыйнай прасторы арганізацый, якія дэ-факта налічваюць некалькі дзесяткаў чалавек, толькі дэзарыентуе выбарцаў. Акрамя таго, партыі-фантомы з'яўляюцца ўдзельнікамі барацьбы за рэсурсы і ўплыў, складаюць няўстойлівыя альянсы з буйнымі арганізацыямі, часам на сваю карысць ініцыююць канфлікты ў адносінах паміж буйнымі арганізацыямі.

Такім чынам, дзейнасць арганізацый-фантомаў стварае дадатковыя перадумовы для глыбокага крызісу партыйнай сістэмы. Сходы партыйных лідэраў — Палітычную Раду аб'яднаных дэмакратычных сіл — выбарцы і прэса адэкватна называюць «палітычным балотам».

Улада нанесла моцны ўдар па грамадскім арганізацыям. 25 лістапада 2005 года парламент прыняў змены ў заканадаўства, якія

паставілі пераважную большасць грамадскіх арганізацый, што тады дзейнічалі, па-за законам.

«Бэбі-бумеры» або новая хваля?

Больш чым на 80 працэнтаў ад складу ўдзельнікаў акцыяў пратэсту ў сакавіку 2006 года — гэта маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 32 гадоў. Неарганізаванасць, непрадуманасць дзеянняў лідэраў апазіцыі ў час акцый пратэсту дала падставы незалежным аналітыкам называць сакавіцкія падзеі «стыхійным моладзевым бунтам супраць рэжыму Лукашэнкі».

Аналітыкі падзяліліся ў меркаваннях наконт матывацыі моладзі, што выйшла на плошчу, нягледзячы на пагрозы і рэпрэсіі. Розніца ў поглядах на матывацыю вызначыла і розныя адказы на пытанні пра тое, ці будзе мець «беларускі майдан» працяг.

Першая група аналітыкаў адзначае, што ў сваёй асноўнай масе маладыя ўдзельнікі акцый пратэсту — гэта так званыя «бэбі-бумеры». У 80-х гадах у Беларусі быў досыць высокі ўзровень нараджальнасці — пэўны «бэбі-бум». Гэта пакаленне беларускай моладзі атрымала сацыяльныя, палітычныя веды ў перыяд 1991–1998 гадоў.

Другая група аналітыкаў звяртае ўвагу на тое, што «стыхійны моладзевы бунт» — гэта не наступства выхаду на палітычную сцэну пакалення «бэбі-бумераў» 80-х. Безумоўна, тыя, хто атрымаў гуманітарныя веды ў школах і ВНУ ў перыяд 1991–1998 гадоў, сапраўды моцна адрозніваюцца паводле сістэмы каштоўнасцей ад тых, хто атрымаў адукацыю «пры Лукашэнку», аднак сакавіцкія моладзевыя пратэсты — праява значна больш глыбокіх зменаў у самім беларускім грамадстве. Гэтыя змены найбольш яскрава праявіліся ў паводзінах тых, хто ў сакавіку выйшаў на плошчу. Змяняюцца адносіны, каштоўнасныя ўстаноўкі, стаўленне да прыватнай уласнасці, улады, дзяржавы, змяняецца ўспрыманне таго, што ёсць норма ў палітычнай сферы, трансфармуецца разуменне паняцця «як гэта мае быць», якім павінен быць характар адносін паміж дзяржавай і грамадзянінам. І гэта сістэма каштоўнасцей, грамадскія настроі ўсё ў большай ступені разыходзяцца з тымі, што існуюць цяпер, што можа запрапанаваць Лукашэнка.

Найбольш творчыя, паспяховыя, інтэлектуальныя прадстаўнікі моладзі не бачаць для сябе перспектыў, ім не хапае месца і паветра ў межах эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай мадэлі, створанай пры Лукашэнку. Мадэль грамадства, якая сфармавалася падчас кіравання Лукашэнкі, арыентаваная не на рызыку, інавацыі, маладосць. Яна арыентаваная на старасць, паслухмянае выкананне сваіх абавязкаў і захаванне ўжо атрыманага сацыяльнага статусу.

Лукашэнка прапануе жыць і працаваць, мець статус залежнага працаўніка, і пры гэтым усведамляць сваю залежнасць, сваё прыніжанае становішча ў адносінах з адміністрацыямі самага рознага ўзроўню — ад кіраўніцтва прадпрыемства, установы, арганізацыі, да структуры «выканаўчай вертыкалі». Пры ўмове лаяльных паводзінаў, няўдзелу ў дзейнасці грамадскіх арганізацый, не падкантрольных уладзе, паслухмянага выканання сваіх функцый, добрых адносін з прадстаўнікамі адміністрацыі, працаўнік мае вялікую верагоднасць у перадпенсійным узросце атрымаць досыць высокі для ўзроўню сваёй лакальнай супольнасці заробак (у параўнанні з сярэднім узроўнем заробку жыхароў адпаведнай вёскі, раёна, горада). Набудзе няновую іншамарку... Займее кватэру або дом і «дачу»... Для таго, каб атрымаць пэўны гарантаваны мінімум, чалавек мусіць згадзіцца са сваім статусам «маленькага», залежнага ад дзяржавы чалавека.

Нават прасоўванне ўверх па сацыяльнай лесвіцы, набыццё ўласнасці, сувязей, вядомасці не дае прадстаўнікам прыватнага бізнесу пачуцця сваёй незалежнасці, значнасці, адчування трываласці свайго становішча. Ва ўмовах рэкорднага ў параўнанні з Расіяй, Украінай і краінамі ЕС падатковага цяжару, заблытанай падатковай сістэмы, нарэшце, ва ўмовах існуючай сістэмы ўлады-ўласнасці, выжыванне і поспех прадстаўнікоў прыватнага бізнесу залежыць ад кантакту з зацікаўленымі прадстаўнікамі ўлады самага рознага ўзроўню, ад іх упісанасці ў патрон-кліентную сістэму самага рознага ўзроўню — ад вёскі да рэспублікі. Мадэль Лукашэнкі надзвычай этатычная. Кожны чалавек занадта часта сутыкаецца з дзяржавай, калі спрабуе рэалізаваць свае інтарэсы, штосьці зрабіць. І ў кожным выпадку падобных сутыкненняў ён адчувае залежнасць, асабістую непаўнавартаснасць. З кожным годам, які аддзяляе ад савецкага, таталітарнага мінулага, з'яўляецца ўсё больш людзей, якіх не задавальняе такое становішча. Самапавага, самарэалізацыя робяцца ўсё большай каштоўнасцю для беларусаў. Акрамя таго, спажывецкі бум падштурхоўвае арыентаваных на самарэалізацыю маладых беларусаў настойваць на адпаведным іх разуменню, годным стаўленні да сябе, патрабаваць ад улады фармавання цывілізаванай мадэлі адносін паміж грамадзянінам і дзяржавай.

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

Ігар Рынкевіч: МІНЮСТ ЯШЧЭ СКАРЫСТАЕЦЦА МАІМІ ПАСЛУГАМІ

Ігар Рынкевіч — ужо больш не адвакат. Прэзідыум Мінскай абласной калегіі адвакатаў увечары 18 красавіка задаволіў заяву адваката Казуліна пра звальненне па ўласнаму жаданню. Рашэнне было прынята паспешліва, прычым самога Рынкевіча прэзідыум да сябе на паседжанне не запрасіў. Прапануем вашай увазе інтэрв'ю ўжо з былым адвакатам Аляксандра Казуліна.

— Ці шкадуеце вы пра тое, што год таму ўзялі на сябе абарону Казуліна і так актыўна яму дапамагалі?

— Я свой Рубікон перайшоў у першы ж дзень, калі пачаў выконваць абавязкі абаронцы апазіцыйнага кандыдата ў прэзідэнты. Чаго хацела ўлада? Яна хацела, каб адвакат, які атрымаў на твары шнар за абарону Казуліна, паводзіў сябе інакш?! *(Маецца на ўвазе, што 2.03.2006 года Рынкевіч быў збіты супрацоўнікамі спецпадраздзялення «Алмаз», калі ён з адвакацкім ордэрам чакаў дазволу прайсці да затрыманага Казуліна ў Кастрычніцкі РАУС Мінска).*

«Ды гэта поўная лухта! Для чаго ў такім разе партыя існуе?» — так Генадзь Зюганаў, лідэр камуністаў Расіі, адказаў на пытанне «Ці не захоўвае КПРФ, быццам наўмысна ўладзе, месца для Лукашэнка?»

«Новая Газета» (Расія)

ВЫБАРЫ

Дэманстранты выступаюць супраць Абдулы Гюля

Абдула Гюль

ТУРЭЦКІ ВАРЫЯНТ

Алег ПЯТРОЎ

16 красавіка ў Турцыі пачалася прэзідэнцкая кампанія. Паводле некаторых палітолагаў, галоўнае пытанне выбараў — ці застанецца Турцыя свецкая дзяржавай.

16 мая 2007 года — апошні дзень прэзідэнцкай кадэнцыі Ахмета Неджэта Сезера. Адпаведна канстытуцыі, парламент павінен абраць наступнага прэзідэнта.

Пераможцу спатрэбіцца галасы як мінімум 368 з 550 дэпутатаў Нацыянальнай асамблеі. Аднак гэта толькі ў выпадку, калі будзе два туры галасавання. У выпадку трэцяга — прэзідэнта абіраюць простай большасцю. Так былі абраныя апошнія тры прэзідэнты.

Гэта, нагадаем, ужо адзінаццатыя выбары ў гісторыі Турэцкай рэспублікі з пачатку яе заснавання Мустафой Кемалем Атацюркам. Аднак яны могуць стаць этапнымі ў гісторыі краіны. Справа ў тым, што ў парламенце дамінуюць прадстаўнікі ісламскай Партыі справядлівасці і развіцця (ПСР). Фракцыя ПСР складаецца з 354 дэпутатаў.

Прэса лічыць, што ад яе на вышэйшы пост могуць быць прапанаваны такія кандыдатуры, як Тайіп Эрдаган, Абдула Гюль, Бюлент Арындж, Ведждзі Генуль і Мехмет Айдын.

Тайіп Эрдаган — папулярны і харызматычны лідэр ПСР, аднак асоба вельмі супярэчлівая. Абдула Гюль — былы эканаміст, а зараз міністр замежных спраў, — лічыцца рэфарматарам, адказвае за дыялог з Еўропай. Ён таксама ўважаецца за прадстаўніка ісламскага крыла, аднак не настолькі жорсткага, як Эрдаган. Бюлент Арындж — адзін з фундатараў ПСР, спікер парламенту і, фармальна, другая асоба ў дзяржаве. Ён карыстаецца шырокай падтрымкай сяброў па партыі. Ведждзі Генуль — міністр абароны. Яго лічаць лепшым кампрамісным кандыдатам. Ведждзі не мае непасрэдных сувязей з ісламістамі і карыстаецца аўтарытэтам сярод генералаў. Нарэшце, Мехмет Айдын — тэолаг па адукацыі, які кіруе камітэтам па справах рэлігіі. Ён таксама кампрамісная фігура, паколькі вядомы памяркоўнымі поглядамі.

На думку аналітыкаў, найбольшыя шансаў мае Тайіп Эрдаган. Аднак свецкая эліта краіны, якую звычайна прадстаўляюць вайскоўцы, суддзі і работнікі сістэмы адукацыі, не хацелі б такога «шчасця». Яны баяцца, што, калі Эрдаган стане прэзідэнтам, ён можа распачаць палітыку ісламізацыі грамадства.

Аднак яны могуць стаць этапнымі ў гісторыі краіны. Справа ў тым, што ў парламенце дамінуюць прадстаўнікі ісламскай Партыі справядлівасці і развіцця (ПСР)

На пазамінулым тыдні ў Анкары была арганізавана найбольш масавая ў гісторыі краіны маніфестацыя за свецкі статус краіны. Па розных падліках, у акцыі ўзялі ўдзел ад 200 да 400 тысяч маніфестантаў.

Сам Эрдаган адмаўляецца ад намераў карэктаваць запаветы Атацюрка, заснавальніка Турэцкай рэспублікі. Еўрапейскі вектар для Турцыі, сцвярджае ён, мае быць прыярытэтам.

Сапраўды, за гады яго прэм'ерства краіна актыўна вяла дыялог наконт уступлення краіны ў ЕС. Часам Эрдаган нават рэзка крытыкаваў Еўропу за сабатаж плану прыёму Турцыі ў еўрапейскую сям'ю народаў.

Аднак яго крытыкі не забываюць, што ніхто іншы, як Эрдаган 9 гадоў таму, публічна дэкларава паэму са словамі: «Мячэці — нашы казармы». Яго партыя неаднаразова спрабавала вярнуць у паўсядзённае жыццё ісламскія нормы, напрыклад, выступіла з прапановай адмяніць забарону насіць у грамадскіх і адукацыйных установах ісламскае адзенне. У правінцыі былі спробы забароны алкаголю. Эрдаган асабіста прапанаваў увесці крымінальную адказнасць для мужа, або жонкі, якія здрадзілі інстытуту шлюбу.

У выніку сучасны прэзідэнт ледзь паспяваў накладаць вета на законапраекты з рэлігійным падтэкстам. Лідэр Народна-рэспубліканскай партыі, галоўнай апазіцыйнай сілы ПСР, ужо заявіла, што, калі пераможа Эрдаган, яна будзе падаваць у канстытуцыйны суд іск з просьбай прызнаць выбары несапраўднымі. А кіраўнік генеральнага штаба ўвогуле заявіў, што прэзідэнтам краіны можа быць выключна асоба з антырэлігійным светапоглядам.

У прынцыпе, сваёй істэрыкай апазіцыя часткова дамаглася свайго.

Згодна з апытаннямі, дзве трэці грамадзян баяцца дэстабілізацыі і выступаюць супраць таго, каб Эрдаган балатаваўся ў прэзідэнты. Здаецца, і самі бонзы ПСР не гатовы і не хочуць ісці на прынцып. На восень прызначаны парламенцкія выбары, і партыя зацікаўлена захаваць свой імідж як гаранта грамадскай стабільнасці.

Праўда, ёсць яшчэ інстытут войска. Генералітэт — гарант рэспубліканскага рэжыму, толькі за апошнія гады вайскоўцы чатыры разы распускалі ўрад на той падставе, што ён нібыта занадта праісламскі.

Вынікам моцнага комплекснага ціску стала заява Эрдагана, што ён быццам бы адмаўляецца ад удзелу ў выбарах. Аднак на канфігурацыю палітычных сіл гэта пакуль не паўплывала: самы большы шанец стаць прэзідэнтам у любым выпадку будзе мець кандыдат ад ісламскага блоку.

Тайіп Эрдаган

ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

РАДХІКА КУМАРАСВАМІ

Спецыяльны прадстаўнік ААН па праблемах дзяцей прадставіла міжнароднай грамадскасці шакуючыя факты пра дзецей-палесцінцаў, якія сядзяць у турмах Ізраіля. Сёння ў турмах Ізраіля знаходзяцца 10 000 палесцінцаў, з якіх 398 — дзеці ў сярэднім 12-гадовага ўзросту, яшчэ 371 — маладзей за 18 гадоў. Большасць з іх трапілі за краты за тэракты. Як правіла, пад тэрактамі разумеюць спробу кінуць у ізраільскі танк кактэйль Молатава. «Амаль кожнае дзіця, якое жыве на Палесцінскіх тэрыторыях, было хоць адзін раз арыштавана і прайшло праз турму», — заявіла Радхіка падчас дакладу. Яна таксама звярнула ўвагу на тое, што працэдура прыцягнення дзяцей да крымінальнай адказнасці вельмі прымітыўная. З дзецьмі абыходзяцца як з вайсковымі палоннымі. Кіраўніцтва ААН запатрабавала ад Ізраілю перагледзець прававыя падставы турэмнага ўтрымання дзяцей, аднак афіцыйны Тэль-Авіў пакуль пакінуў просьбу без рэакцыі.

МАЦЕЙ ГЕРТЫХ

Дэпутат Еўрапейскага парламенту ад правай польскай кансерватыўнай партыі «Ліга польскіх сем'яў» публічна вызнаў, што дыназаўры і людзі ніколі не маглі жыць разам. Раней ён сцвярджаў абсалютна процілеглае, калі выступаў з трыбуны парламенту і заклікаў адмяніць выкладанне ў еўрапейскіх школах тэорыі эвалюцыі Дарвіна. У якасці эрзацу ён прапанаваў тэорыю так званага крэцыянізму. Крэцыяністы лічаць, што жыццё на планеце з'яўляецца справай нейкай вышэйшай істоты, Бога. Каб пераканаць дэпутата ў тым, што эвалюцыянісцкая тэорыя больш вартая з навуковага пункту гледжання, чым крэцыянісцкая, давялося ладзіць для яго спецыяльны семінар, прысвечаны прадмету. На семінары пра эвалюцыю выступілі вядомыя навукоўцы, якія са спасылкай на апошнія адкрыцці, пераканалі Гертыха ў тым, што эвалюцыянізм застаецца найбольш лагічнай тэорыяй, якая можа растлумачыць працэсы. Напрыканцы семінару скандальны дэпутат здаўся і пагадзіўся, што тэорыя Дарвіна сапраўды чагосьці вартая.

ЛУІС ПАСАДА КАРЫЛЕС



Эмігрант з Кубы выклікаў новы выбух антыамерыканскіх настрояў і зрабіў свой сціплы ўнёсак у стварэнне геапалітычнай восі Каракас — Гавана. Карылес (сёння яму ўжо 70 гадоў) — былы агент ЦРУ, які з'яўляецца падазроным у арганізацыі ў 1976 годзе выбуху на борце кубінскага самалёта, што ляцеў з Венесуэлы з камандай спартсменаў. Тады ў выніку тэракту загінула 76 асобаў. Кубінскі і венесуэльскі ўрады даўно дамагаўся выдачы Карылеса. Некалькі гадоў таму амерыканцы былі вымушаны арыштаваць свайго былога саюзніка, які жыў сярод братоў-антыкастрыстаў у Фларыдзе. Здавалася б, Карылесу пагражае турма: як высветлілася, ён да таго ж парушыў міграцыйнае заканадаўства ЗША. Аднак следства зацягнулася на два гады. Хадзілі чуткі (так прынамсі піша галоўны орган Кубінскай кампартыі), што Карылес шантажаваў былых калег з ЦРУ тым, што выдасць шмат сакрэтаў амерыканскай разведкі, калі яго выдадуць кубінцам. Так ці інакш, нечакана напрыканцы мінулага тыдня Карылеса выпусцілі на волю з турмы ў Осціне (Тэхас). Натуральна, Чавес і Кастра не змаглі не звярнуць увагу на факт вызвалення Карылеса: Каракас і Гавану трасуць антыамерыканскія дэманстрацыі.

ПРАВІНЦЫЯ

БЕЛАРУС, ДЗЕ Б НЕ БЫЎ

Язэп ПАЛУБЯТКА

Нас знявечыў тэрмін «правінцыял». Калі вясковец, які ўладкаваўся ў горадзе, не жадае засведчыць сваё сапраўднае паходжанне, то кажа: «Я інтэлігент у першым калене». Жыць у вёсцы і адчуваць сабе асобаю не толькі на абшарах сельсавета і краіны, але і ў замежжы — можна. Адбываецца гэта, калі індывідуум, незалежна ад месца пражывання, асэнсоўвае сваю вартасць у чалавечай супольнасці.

Лявону Карповічу з вёскі Лунна, што на Мастоўшчыне, каб займець той статус, спатрэбілася пражыць амаль жыццё. Пачаткам стала ўсведамленне таго, што ён — беларус.



Шлях пазнання

Гэта зараз арганізатары міжнародных філатэлістычных выстаў маюць гонар запрасіць Лявона Карповіча да ўдзелу; журналісты першага канала польскага тэлебачання прыязджаюць, каб узяць інтэрв'ю; пісьменніца Вольга Іпатава мае на мэце прысвяціць яму твор. А калісьці...

Нарадзіўся Лявона Карповіч у 1944 годзе ў Ваўкавыску. Горад быў разбураны вайной. Гадаваўся без бацькі, і першае, што зведаў у жыцці, — голад. У памяці засталіся моманты, калі маці вярталася з працы і несла бохан хлеба. Бег насустрач з радасці, што можа добра паесці. Не мог дачакацца таго дня, калі паедзе да дзеда ў вёску, дзе ўволю пап'е малака. Жыццё патрабавала працы з маленства. На руінах з дзядзькамі капаў цэглу, якую потым прадавалі. Вучням пачатковых класаў, дзеля заробку, на цагельні грузіў цэглу. Яна была такая гарачая, што на руках вырасталі пухіры.

А аднойчы, калі вучыўся яшчэ ў пятым класе, дзядзьку-шафёра сярод ночы паслалі адвозіць зерне. Памочнікам ён узяў пляменніка, бо дарослыя не пагадзіліся ехаць працаваць у гэты час. Натаміўся так, што ўсю дарогу дахаты спаў у кузаве самазвала проста на жалезе.

Дастатку не было і ў бабулі, што жыла ў вёсцы Цярэшкі каля Ваўкавыска. Улетку з аднагодкамі ў рэчцы лавіў рыбу. Аднак гэты дадатак да бабінага малочнага стала нечакана знік. У вёсцы арганізавалі калгас, у панскім двары зладзілі кароўнік. Новыя гаспадары, у адрозненні ад пана, гноем забрудзілі рэчку. Рыбы не стала.

Вучыўся Лявон на выдатна, займаўся спортам, быў піянерам, камсамольцам. Пасля заканчэння васьмі класаў набываў спецыяльнасць у Жыровіцкім сельгастэхнікуме Слонімскага раёна.

Скончыў навучанне. Атрымаў «чырвоны дыплом» і накіраванне механікам у калгас. Спецыяліст там быў запатрабаваны, але на працу не прынялі, бо пастрыжаны быў пад так званую «канатку». Паколькі ў калгасе не далі даведкі, што малады спецыяліст не можа быць працаўладкаваны, то кіраўнікі іншых гаспадарак Ваўкавыскага раёна таксама адмаўлялі ў працы. За дапамогаю Лявон звярнуўся да старшыні райкама партыі. Размова на прыёме ішла не пра працаўладкаванне спецыяліста, а пра яго маральны воблік. Падчас гутаркі юнак не сцярпеў і выказаўся кшталту «ты хіба дурань». Але ўсё ж Лявон уладкаваўся на працу на рамонтны завод у мястэчку Ражанка Шчучынскага раёна. Адслужыў у войску. Вярнуўся на былое месца працы. Потым у сувязі з сямейнымі абставінамі пераехаў на Мастоўшчыну і пачаў настаўнічаць. Нягледзячы на тое, што ўжо завочна вучыўся ў сельгасінстытуце ў Мінску, новая праца запатрабавала займець яшчэ адну адукацыю, і ён паступіў на матэматычны факультэт Гродзенскага педінстытуту.

Усё ў Карповіча складвалася ў тыя часы ўдала: сталая праца, дырэктарская пасада, партыйны білет у кішэні, а галоўнае — было жаданне будаваць светлую будучыню.

Час роздуму

Вера ў светлую будучыню згасла не раптоўна. Падставай да змены жыццёвых арыенціраў стаў выпадак. На паседжанні раённага аддзела адукацыі разглядалі асабістую справу Алеся Мікалаевіча Белакоза. Гэта пазней яму прысвояць ганаровыя званні: выдатнік народнай асветы, заслужаны работнік культуры, узнагародзяць медалём Францыска Скарыны. У тыя часы ён настаўнік беларускай мовы і літаратуры з вёскі Гудзевічы задумаў па ўласнай ініцыятыве арганізаваць музей. Раённаму кіраўніцтву гэта не спадабалася, і пачаліся разборкі. На адным з паседжанняў разам з іншымі дырэктарамі школ прысутнічаў Лявон Карповіч. І вось, калі чыноўніца ад адукацыі, жадаючы паказаць свае веды па гісторыі Беларусі, назвала Францыска Скарыну паэтам, то Алесь Белакоз падняўся, сказаў: «Калі Скарыну лічаць паэтам, то тут мне рабіць няма чаго». І пакінуў залю.

Гэта здарэнне дало Лявону Карповічу штуршок да пачатку вывучэння гісторыі роднага краю і роднай мовы. Пераглядзець свае погляды на жыццё ў сталым узросце прымусіў яго твор Андрэя Платонава «Чэвенгур». Па іншаму стаў успрымаць рэчаіснасць. Знікла ўпэўненасць, што пабудова светлай будучыні ідзе ў правільным напрамку. Адным з першых у раёне напісаў заяву пра выхад з КПСС. На сход, які разглядаў яго заяву, прыйшло пяцьдзесят землякоў, прыехала раённае кіраўніцтва. Напрыканцы сходу Лявон сказаў прарочыя словы: «Сёння ў гэтай зале вас пяцьдзесят чалавек, а праз год будзе ўдвая менш». Памыліўся. Праз год КПСС не стала.

Час дзеянняў

Пачатак дзевяностых мінулага стагоддзя — пік палітычнай і грамадскай дзейнасці ў розных накірунках. Лявон Карповіч не толькі становіцца актыўным сябрам грамадскіх арганізацый, што ўзнікалі ў тыя часы. Ён прагне большага. Супрацоўнічае з польскай першапачатковай школай на Беларусі, са Шчэцінскім інстытутам лакальнай дэмакратыі ва Усходняй Еўропе. Наведвае Італію, Ватыкан, дзе прысутнічае на набажэнстве Папы Рымскага Яна Паўла II. У Парыжы шукае помнік земляку Адаму Міцкевіч на беразе Сены. Падчас стажыроўкі ў Чыкага наведвае помнік Тадэвушу Касцюшку, наладжвае кантакты з беларусамі — эмігрантамі пасляваеннай хвалі. І дзе б не быў, размаўляе выключна на беларускай мове.

Самае складанае — спалучаць працу настаўніка і займацца палітыкай. На вёсцы гэта складаней удвая, бо кожны чалавек на відавоку, як і кожны яго ўчынак. І тым не менш у яго хапіла мужнасці, нягледзячы на перадпенсійны ўзрост, выступіць арганізатарам правядзення ў вёсцы альтэрнатыўных прэзідэнцкіх выбараў 1999 года. З працы не звольнілі, але ў пракуратуру выклікалі. Падчас прэзідэнцкіх выбараў 2006 года міліцыя канфіскавала ўласны архіў і кампутарную тэхніку.

Але Лявон Карповіч працягвае працаваць. З сябрамі-аднадумцамі адшукаў магілу заходнебеларускага паэта Міхася Явара, якому яны ўстанавілі помнік. Даследуе гісторыю мястэчка. Са сваімі паплечнікамі дамогся ад мясцовых уладаў, каб быў пастаўлены памятны знак 1549 габрэям, што жылі тут і былі знішчаны падчас другой сусветнай вайны.

Акрамя таго, неўзабаве Лявон Карповіч захапіўся філатэліяй. І ўжо ў сярэдзіне 90-х разам са сваім сябрам Фрэдэрыкам Гушчам са Скідаля пачынае ладзіць выставы. Яго экспазіцыі адметныя — выключна беларускамоўныя і прысвечаныя гісторыі Беларусі. На дзвюх апошніх міжнародных філатэлістычных выставах «Белфіла» экспазіцыя Лявона Карповіча ўзнагароджвалася сярэбранымі медалямі. Мінулым летам у час Дзён Беларусі ў Шчэціне (Польшча) для паказу яго філатэлістычных збораў мясцовыя ўлады прадставілі цэнтральную гарадскую бібліятэку. Экспазіцыя мела поспех. Сюжэт пра яе быў паказаны па тэлебачанні.

Знешне Лявон Карповіч — самы звычайны вясковы чалавек. Побач з яго домам вялікі сад, дагледжаны агарод, маецца жыўнасць. І тым не менш Лявон Карповіч — асоба.

АЛЬБОМ

КАЖУЦЬ, ГЭТА НАМ КАРЫСНА

Алег ДЗВІНСКІ

Гурт *«Ляпис Трубецкой»* выдаў альбом *«Капитал»* не 1 мая, як было заяўлена раней, а ўжо пры канцы мінулага тыдня.

Усяго на новай плытцы, якую музыкі першапачаткова планавалі назваць *«Золотое сало и жир»* і прысвяцілі барацьбе з культам назапашвання, запісана 11 песень. «Гэта звязана з тым, што мы аддалі дыск дыстрыб'ютарам у Расіі, Украіне і Беларусі, — тлумачыць акалічнасці датэрміновага выпуску альбома прадзюсер «Ляпісаў» Яўген Калмыкоў. — Кожны выпускаў у свой час. Афіцыйная дата рэлізу — першае мая. І канцэрт мы праводзім першага. Для нас гэта няпросты дзень».

«Капитал» быў запісаны «Ляпісамі» ў Кіеве. Працай кіраваў украінскі саўндпрадзюсер Віталь Цялезін, вядомы па супрацоўніцтву з *«Океаном Ельзи»* і *«Братьями Грим»*. Значную частку папулярнасці альбома яшчэ да яго выхаду склалі песні і кліпы «Харэ» і *«Капитал»*, якія ў лічаныя дні сталі лідэрамі ратацый ва Украіне і Беларусі.

Неўзабаве *«Ляпис Трубецкой»* збіраецца зняць яшчэ два відэаролікі на трэкі з новай плыткі, але наконт таго, якія менавіта песні будуць візуалізаваныя, адзінства ў гурце няма. Па словах Яўгена Калмыкова, атрымалася «нечакана, вострасацыяльна, ну — і запісана добра!»

З пункту гледжання лідэра і ідэйнага натхняльніка «Ляпісаў» Сяргея Міхалка, галоўнае ў *«Капитале»* — тое, што ён створаны шчыра. «Зараз мы нікім не прыдурваемся і робім тое, што

нам падабаецца, — кажа Міхалок. — Я вярнуўся да таго, з чаго ўсё пачыналася, — да цвёрдай сатыры і магутнай музычнай падачы».

Цалкам па-антыглабалісцку выглядае і агучанае Яўгенам Калмыковым нежаданне гурта зарабляць новым рэлізам грошы. «Для нас дыск — гэта найперш папулярызацыя творчасці. Мы ніколі не зараблялі альбомамі, затое возьмем канцэртнымі турамі».

Безумоўна, *«Капитал»* — адзін з галоўных рок-рэлізаў года не толькі на радзіме «Ляпісаў» у Беларусі, але і ва Украіне, дзе пазіцыі гурта традыцыйна моцныя, і ў Расіі. Па словах Сяргея Міхалка, шум вакол плыткі супастаўны з рэзанансам ад першага студыйніка *«Ляписа Трубецкого»* пад назвай *«Ты кинула»*. Загалоўную песню альбома нават узялі на *«Русское радио»* — чаго з песнямі ЛТ не здаралася з канца 1990-х.

ПАЛІТЫКА І КАХАННЕ

ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ПАМКНЕННЕ ТЭАФІЛІ САПЕГІ

Наталля ГАРДЗІЕНКА

Барскую канфедэрацыю 1768–1772 гадоў гісторыкі завуць жаночай, паколькі жанчыны шмат уплывалі на яе кіраўніцтва. Яны мелі розныя мэты і дзейнічалі даступнымі ім сродкамі: арганізоўвалі свае лобі, фінансавалі вайсковую і дыпламатычную дзейнасць, а часам нават самі займаліся прадстаўніцтвам канфедэрацкіх інтарэсаў пры еўрапейскіх дварах.

Тэафіля Сапега з сынам

Адной з такіх жанчын была Тэафіля Стрэжыслава Сапега, якая пакінула досыць падрабязны дзённік падзей Барскай канфедэрацыі і свайго ўдзелу ў ёй.

Тэафіля Стрэжыслава нарадзілася 8 жніўня 1742 года ў магнацкай сям'і. Яе бацька Юзаф Аляксандр Ябланоўскі меў крыху дзіўную для свайго часу фантазію, бо даў дачцэ імя Стрэжыслава, замененае потым на больш звычайнае Тэафіля. Маці — Караліна — паходзіла з Радзівілаў, а ў першым шлюбе была за Казімірам Сапегам. Дзяўчына, такім чынам, мела сваяцкія сувязі з найвядомейшымі і наймагутнейшымі родамі арыстакратыі Вялікага княства Літоўскага.

Тэафіля атрымала добрае выхаванне і з маладых гадоў зацікавілася палітыкай. Як многія жанчыны-магнаткі свайго часу, яна марыла адыграць значную палітычную ролю ў краіне. Рэшткі ліставанняў сведчаць пра схільнасць дзяўчыны да палітычных інтрыг ужо ва ўзросце 20 гадоў.

У гэты час яна пабралася шлюбам з мсціслаўскім ваяводам Юзафам Сапегам. Шлюб меў відавочны дынастычны характар, аднак маладая, амбітная, актыўная жонка стала на пэўны час сапраўднай паплечніцай Юзафа.

Як і шмат каму з тагачасных магнатаў, Сапегам не надта падабалася сітуацыя ў Рэчы Паспалітай. Стаўленік Кацярыны II кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі разам з усёй краінай усё болей трапляў у залежнасць ад Расіі. Адказам на гэта стала скліканая ў 1768 годзе Барская канфедэрацыя — рух узброенай апазіцыі, — што мела выразны антырасійскі характар і нават выношвала планы фізічнага знішчэння караля. Тут перакрыжаваліся інтарэсы розных магнацкіх кланаў: у ёй бралі ўдзел і Радзівілы, і Агінскія, і Браніцкія...

Актыўным удзельнікам канфедэрацыі, і нават вайсковым кіраўніком яе на землях Вялікага княства Літоўскага быў муж Тэафілі Юзаф Сапега. У сваёй дзейнасці ён быў сапраўды падтрыманы жонкай. Яна, як і шмат іншых жанчын у тагачасных магнацкіх колах, уважала сябе за сапраўдную патрыётку, здольную нешта зрабіць на карысць Бацькаўшчыны, хоць бы і праз удзел у канфедэрацкай вайне, якую тады шмат хто лічыў змаганнем за незалежнасць Рэчы Паспалітай. У выніку высвятлення канфедэрацкіх войскаў рускімі з беларускіх зямель у 1769 годзе, Тэафіля паехала следам за мужам у Гданьск, адкуль скіравалася на поўдзень Польшчы, да Цешына, дзе пэўны час знаходзілася кіраўніцтва Барскай канфедэрацыі.

Яна суправаджала Сапегу ў вандроўках па розных канфедэрацкіх справах, стала для яго сакратаркай і дарадчыцай. У сваім вельмі падрабязным дзённіку тых падзей Тэафіля тлумачыла ўдзел у канфедэрацыі жаданнем дапамагчы краіне захаваць незалежнасць. «А калі слабасць полу зрабіла мяне няздольнай насіць зброю, плаціла я агульнай Айчыне за права грамадзянства, падзяляючы пакуты падарожжаў і разнастайных выпадкаў прыкрасці, а таксама словам — служыла пяром і парадай», — пісала яна і дадавала: «У агульных абавязках пол не вызваляе ад працы».

І гэтая 27-гадовая жанчына заўзята працавала. Адзін з сяброў нават жартаваў, што суайчыннікі павінны сабраць грошы, каб набыць ёй акуляры ў якасці кампенсацыі за сапсаваны на сакратарскай працы зрок.

Жаданне дапамагчы канфедэратам знайсці падтрымку сваёй дзейнасці за мяжой вымусіла Тэафілю ў 1771 годзе разам з мужам накіравацца праз Дрэздэн і Мюнхен у Францыю. Яе прымалі пры розных еўрапейскіх дварах, яна вяла ліставанне ад імя кіраўнікоў канфедэрацыі, імкнулася пашырыць падтрымку іх з боку французскіх уладаў і сама склала ліст да Людовіка XV з просьбай пра дапамогу змагарам.

Нягледзячы на сваю палітычную дзейнасць, Тэафіля Сапега ніколі не забывалася, што яна яшчэ і жанчына, прывабная і смелая. Падтрымка мужа ў палітычных справах не абавязкова значыла для яе неабходнасць быць узорнай жонкай. Хадзіла вельмі шмат чутак пра яе раманы і з сябрам па Барскай канфедэрацыі Ігнацем Богушам, які суправаджаў яе ў падарожжы па Еўропе, і з прадстаўнікамі найвышэйшага афіцэрства страсбургскага гарнізону, і з вядомым кардыналам Роганам — французскім прынцам, пазнейшым удзельнікам ці ахвярай славутай авантуры з дыяментавым калье для каралевы Марыі Антуатнэты. Аднак жыццё ў Страсбургу, Парыжы, свецкія забавы ў Версалі не давалі магчымасць забыцца на тыя праблемы, што засталіся на радзіме.

Тэафіля Сапега вельмі доўга верыла ў поспех Барскай канфедэрацыі, заставалася ў кантакце са славутымі яе дзеячамі Міхалам Вяльгорскім, Каралем Станіславам Радзівілам, Казімірам Пуласкім і адмаўляла нават думку пра магчымасць прымірэння з каралём Станіславам Аўгустам і Расіяй. Аднак канфедэраты, так і не атрымаўшы належнай падтрымкі звонку, былі разгромленыя расійскімі войскамі на чале з Суворавым, і Рэч Паспалітая аказалася ўпершыню падзеленая паміж трыма суседнімі дзяржавамі.

Моцнае расчараванне вымусіла Тэафілю адысці ад палітычнай дзейнасці на вельмі працяглы час і заняцца сямейнымі справамі. Сапегі ў гэты час мелі сур'ёзныя матэрыяльныя складанасці, бо фактычна знаходзіліся ў эміграцыі. Пасля нараджэння сына Аляксандра і дачкі Ганны, падчас няспынных спробаў наладзіць жыццё ў Францыі, дзе Тэафіля марыла застацца назаўсёды, яе адносіны з мужам напаткаў сур'ёзны крызіс. Зласліўцы сцвярджалі, што свабодалюбівая жанчына не была ўпэўненая ў тым, хто быў сапраўдны бацька яе дзяцей. У перыяд найбольш вострага расчаравання і канфлікту з мужам у сакавіку 1776 года яна нават зрабіла спробу скончыць жыццё самагубствам.

Вымушанае вяртанне на радзіму праз колькі гадоў не палепшыла адносіны з мужам. Тэафіля вырашыла жыць асобна ад яго ў спадчынным маёнтку Тэафільпаль на Палессі. Юзаф Сапега стала пасяліўся ў сваіх Ляхаўцах на Валыні і толькі зрэдку адведваў дзяцей.

Расчараваная ў палітыцы, Тэафіля па вяртанні на радзіму больш не імкнулася да актыўнай дзейнасці, хоць пільна сачыла за тым, што адбывалася ў тагачаснай Еўропе і Рэчы Паспалітай. Былая канфедэратка, яна вельмі адмоўна паставілася да падзеяў Французскай рэвалюцыі і дзейнасці Напалеона, затое таемна аказвала дапамогу касцюшкаўцам, у памяць пра ўласныя патрыятычныя памкненні часоў Барскай канфедэрацыі.

Прыналежная да найбольш эмансіпаваных і ўладных жанчын сваёй эпохі, Тэафіля Сапега пад канец жыцця адышла ад удзелу ў прыдворных мерапрыемствах, але захавала ліставанне з некаторымі вядомымі інтэлектуаламі свайго часу, сярод якіх быў паэт Францішак Карпіньскі.

Да смерці ў 1816 годзе, яна гадавала ў сваім маёнтку белых мопсаў і розных птушак, асабліва любіла папугаяў. Акружаная вялікім уласным двором, апранутая звычайна па-мужчынску, Тэафіля засталася ў памяці суседзяў і сяброў праз свае дзівацтвы і любоў да фармальнасцяў этыкету, а таксама праз успаміны пра тое далёкае патрыятычнае памкненне, што прынесла ёй так шмат расчараванняў.

Выкраданне Станіслава Папяткоўскага барскімі канфедэратамі

Тэафіля атрымала добрае выхаванне і з маладых гадоў зацікавілася палітыкай. Як многія жанчыны-магнаткі свайго часу, яна марыла адыграць значную палітычную ролю ў краіне. Рэшткі ліставанняў сведчаць пра схільнасць дзяўчыны да палітычных інтрыг ужо ва ўзросце 20 гадоў

Нягледзячы на сваю палітычную дзейнасць, Тэафіля Сапега ніколі не забывалася, што яна яшчэ і жанчына, прывабная і смелая. Падтрымка мужа ў палітычных справах не абавязкова значыла для яе неабходнасць быць узорнай жонкай

ЛЕГЕНДЫ ПАСТАЎШЧЫНЫ

З АПАВЯДАННЯЎ БАБЫ СТАСІ

На хвіліну плошча змярцвела. А пасля надрыўны жаночы крык працяў наваколле. Ашалелая маці кінулася да сына, што заціх у лужыне крыві. Толькі рукі маці не паспелі дакрануцца свайго ўжо мёртвага дзіцяці. Прасвісцела генеральская шабля — і акрываўленая жаночая галава пакацілася пад ногі аслупянелым ад жаху жаўнерам.

— Ма-ма-а-а! — з-за адкрытых касцельных дзвярэй данёсся роспачны дзіцячы крык, ды маленькая дзяўчынка кінулася праз шыхт шведскіх жаўнераў да нерухомых целаў маці і браціка.

Дзяўчынку б чакаў такі самы лёс, як і яе блізкіх, каб у гэты час яе не выратаваў адзін са шведскіх афіцэраў. Ён без разваг накіраваў свайго каня да дзяўчынкі, на хаду падхапіў яе на рукі і моцна прыціснуў да сваіх грудзей. Калі дзяўчынка перастала вырывацца з рук, цела яе абмякла, і яна залілася слязамі, афіцэр беражліва перадаў яе аднаму з жаўнераў.

— Аднясі яе ў касцёл да дзяцей, — з болем у голасе загадаў ён падначаленаму.

Калі афіцэр развярнуў каня, твар яго адразу змяніўся: на бледным шляхетным твары палыхнулі агнём гневу вочы. Ён пад'ехаў да генерала.

— Генерал Свэнсан, што вы робіце?! Пабойцеся гневу Божага! — горача загаварыў афіцэр. — Праз гэта золата вы страцілі галаву! Вы пачалі ваяваць з дзецьмі і жанчынамі! Што зрабілі вам гэтыя людзі? Вы ганьбіце свой шляхетны род! Вы ганьбіце гонар баявога афіцэра! Вы ганьбіце нашу краіну і караля!

— Маўчаць! — увесь чырвоны ад злосці абарваў генерал свайго падначаленага. — Што вы сабе дазваляеце, палкоўнік! — пыхліва прамовіў ён. — Стаць у шыхт!

Стройная постаць сівога палкоўніка нават не зварухнулася. Яго горды арліны нос, як баявая зброя, быў накіраваны на генерала, а калючыя, разумныя вочы свідравалі свайго начальніка наскрозь.

Генерал Свэнсан пабялеў.

— Палкоўнік Горн! Вы чулі загад?!

— Я — барон Магнус Горн! — з пагардай да генерала прамовіў палкоўнік. — Род Горнаў ніколі забойцам дзяцей і мяснікам не падпарадкоўваўся!

— Абражаць генерала?! Не выконваць загад?! — зароў Свэнсан. — Арыштаваць здрадніка!

Але ніхто са шведскіх афіцэраў і жаўнераў нават пальцам не крануў.

— Гэта што, бунт?! — злосць зусім заслала вочы генералу. Ён выхапіў з-за пояса пісталет і стрэліў у палкоўніка.

Горн уздрыгнуў ад удару кулі, яшчэ некалькі хвілін ганарліва трымаў постаць, а пасля, калі сілы яго пакінулі, каменем рухнуў пад ногі каня. Генерал выцягнуў з-за пояса яшчэ адзін пісталет і падняў шкляныя вочы ад залітага крывёю палкоўніка на сваіх падначаленых.

— Ну, хто яшчэ не збіраецца выконваць мае загады? — голасам атрутнага гада прашыпеў ён, шукаючы новую ахвяру.

— Я, граф Інгвар Дэ ла Гарды! — прагучаў раптам гучны голас, і з шыхта выйшаў шыракаплечы капітан.

Выбухнуў стрэл, і на грудзях капітана, багата ўсыпаных баявымі ўзнагародамі, пачала хутка расплывацца чырвоная пляма. Граф захістаўся і паціху стаў асядаць на пасыпаны пылам брук плошчы.

— Я, барон Якаб Карлсан! — з шыхта выйшаў малады афіцэр.

— Я, герцаг Карл Уленброк! Я, барон Олаф Сцівенсан! — далучыліся да яго яшчэ два юных героя.

Пакуль генерал перазараджаў пісталеты, усе тры маладых афіцэры самаахвярна чакалі сваёй кулі.

Яшчэ не перасталі курчыцца ў перадсмяротных сутаргах гэтыя тры героя, як твар яшчэ аднаго юнага афіцэра пазбавіўся здранцвення. Толькі што белы і скамянелы, як палатно, ён успыхнуў яркім, чырвоным агнём высакароднага гневу.

— Генерал, гэта подласць! Вы вар'ят! Мой абавязак паведаміць каралю! — выгукнуў хлопец і скочыў на каня.

Свэнсан адабраў стрэльбу ў аднаго жаўнера і стрэліў афіцэру ў спіну. Юнак захістаўся, але ўтрымаўся ў сядле.

Стрэльба ўжо другога жаўнера апынулася ў руках генерала, але дабіць параненага ён не паспеў. Чатыры таварышы рашучага юнака таксама ўскочылі на каней і закрылі яго ад генеральскіх куляў.

— Густаў, скачы хутчэй! Гэтага вар'ята трэба спыніць! Мы цябе прыкрыем! — крыкнуў хлопцу адзін з іх.

Імгненне — і паранены вершнік знік за будынкамі Судаўскай вуліцы. А праз некалькі хвілін прабітыя кулямі перасталі біцца сэрцы апошніх чатырох шведскіх афіцэраў.

Разабраўшыся са сваімі падначаленымі, Свэнсан паклікаў перакладчыка і звярнуўся да местачкоўцаў.

— Мне здаецца, вы ўжо паверылі ў маю рашучасць. — заявіў ён лынтупскім людзям. — Дык вось, калі праз палову гадзіны вы не пакажыце, дзе схавана ваша золата, усе вашы дзеткі жыўцом згараць разам з гэтай папскай

будынінай, — генерал паказаў пальцам на драўляны касцёл і выцягнуў з кішэні гадзіннік.

— Час пайшоў! — абвесіў ён, і каб напэўна зламіць гэтых людзей, накіраваў каня на целы малога Янкі і яго маці.

Немагчыма перадаць словамі, што рабілася ў душах лынтупчанаў, і нават шведскіх жаўнераў, калі яны ў жаху ўбачылі, як капыты генеральскага каня пачалі трушчыць кволыя костачкі нерухомага Янкі і топчуцца па абезгалоўленаму трупу яго маці.

Вось тады і праклялі тое золата местачкоўцы.

* * *

У гэты час жаўнеры, якія вартавалі дзяцей, адрамантавалі паламаныя імі ж пры рабаўніцтве касцёла дзверы і зачынілі іх. Маленькія касцельныя вокны амаль не прапускалі святла, таму ўнутры панаваў паўзмрок.

У гэтым паўзмроку дзеці, напужаныя крывавай трагедыяй, якая толькі што адбылася на іх вачах, збіліся ў купку ля дзвярэй і ціха плакалі. Толькі адна дзевяцігадовая Анця ўкленчыла перад разрабаваным і паламаным алтарам. Усе абразы і выявы Ісуса былі вынесены шведскімі рабаўнікамі, таму дзяўчынка ўзняла твар да высокай столі старажытнага касцёла і са слязьмі на вачах малілася за сваіх толькі што забітых маму і браціку Янку.

Праз некаторы час Анця адчула, што нешта яе вымушае адарваць погляд ад столі. Дзяўчынка міжвольна падпарадкавалася і апусціла вочы. У левым ад алтара цёмным куту, над самай падлогай, ішлі ледзь заўважныя светлыя промні. Вось і ў левай руцэ яна адчула чыюсьці маленькую далонь і зразумела — гэта брацік, Янка.

Невядомая сіла падняла на ногі, а рукі мамы і браціка падвялі да таго, што ззяла на падлозе. Там дзяўчынка ўбачыла сціплы абразок святой Ганны, на які не пакваліліся рабаўнікі. І гэты абразок — во цуд! — свяціўся, стварыў над сабой у паветры німб. «Божа мой! — здагадалася Анця, — душы мамы і Янкі прывялі мяне да маёй святой заступніцы!»

Дзяўчынка падняла абразок, павесіла яго на сцяну і пачала шчыра маліцца за выратаванне свайго роднага мястэчка, сваіх сяброў, сяброўак, суседзяў і знаёмых, бо бліжэй за іх у яе на ўсім белым свеце нікога не засталося. Незаўважана вакол маленькай Анці сабраліся і астатнія дзеці. Яны ўкленчылі перад абразком і, як і Анця, пачалі ціха маліцца. Ніхто з іх больш не плакаў, не лямантаваў, і нейкая душэўная дабрыня, што сыходзіла разам са святлом ад абразка святой Ганны, ахінула іх сэрцы.

* * *

Княгіня Альжбэта, жонка тагачаснага ўладара Лынтупаў, троцкага кашталяна Яна Бжастоўскага, прыспешвала сваіх людзей і штохвілінна паглядала на Дамініка, свайго пятнаццаці гадовага пляменніка. Яшчэ ўчора вечарам людзі, пасланыя ёй сачыць за шведскім войскам, паведамілі, што чужынцы сышлі з мястэчка ў бок Свіраў. Трэба было тэрмінова вяртацца ў Лынтупы наводзіць парадкі ў маёнтку пасля рабаўніцтва шведаў. А тут — затрымка, бо ўсю ноч і палову дня яе дваровыя вымушаны былі ганяцца па лесе за гэтым падшыванцам Дамінікам, які ўздумаў уцячы на вайну ў каралеўскае войска. Добра, што Караліна, яго сястра, хутка заўважыла знікненне гэтага аболтуса.

«Вось падшыванец, — злавалася княгіня, — тут столькі клопату, а ён на вайну сабраўся. Паспееш яшчэ, наваюешся, падрасці хоць трохі. Гарачы як бацька яго, Зыгмант Агінскі. Ну што, злажыў той сваю галаву на вайне, чым загнаў у магілу сястру маю Станіславу, жонку сваю, дзяцей сіротамі пакінуў. Добра, Караліна дарослая ўжо, хутка замуж выдаваць. А гэты Дамінік без мужчынскай рукі зусім ад рук адбіўся. Ратунку няма, толькі пра вайну і марыць. Не ведаю, што рабіць... Хутчэй бы гэта праклятая вайна скончылася. Хаця б вярнуўся жывым з яе мой любы Ян. Можа, хоць ён бы гэтаму ёлупню мазгі ўставіў... »

Ззаду за брычкай цёткі пад вартай двух дваровых княгіні плёўся на вараным кані Дамінік. Галава ў хлопца была апушчаная долу, ён не перастаючы хліпаў носам, а па яшчэ ружоваму дзіцячаму твару раз-пораз сцякалі буйныя кроплі слязінаў.

«Што цяпер мне сказаць хлопцам? — думаў у роспачы юнак. — Што цётка ад сваёй спадніцы не адпусціла? Сам жа падгаварыў іх збегчы ў каралеўскае войска, і сам жа не з'явіўся ў вызначанае месца... Што цяпер рабіць? Усе мужчыны на вайне, Радзіму ад чужынцаў бароняць, тата жыццё сваё за яе аддаў... А я... Зганіў свой род старажытны, святую памяць пра сваіх маму і тату... Што яны пра мне думаюць на нябёсах?»

Хлопец міжвольна падняў вочы да неба, як бы імкнучыся разгледзіць сярод аблокаў сваіх бацькоў. Пасля вочы яго апусціліся, і ён тужлівым позіркам агледзеў наваколле.

Толькі што абоз княгіні выехаў з велічнай дубровы на чыстае поле, і цягучы мядовы пах дзяцельніка (так у гэтай мясцовасці чамусьці называюць траву) ды аднатоннае гудзенне пчолаў змяніліся на свежы пах палыну, што бадзёрыць душу, ды нястройнае стракатанне конікаў.

Абапал дарогі хваляваўся ад подыху свежага ветру лазурак кветак льнянога поля, далей пераходзіў у жоўта-зялёнае мора жыта, дзе здалёку сінія ліхтарыкі валошак дадавалі яму блакітнае адценне, сапраўдны салядынавы колер. А яшчэ далей, на ўзгорку, у атачэнні густа-зялёных разлапістых клёнаў выглядалі цёмнамышастыя шкілеты сялянскіх пабудоў.

«Белянішкі, — пазнаў знаёмую вёску Дамінік, — вунь і іхны Абярэг — дуб ля дарогі. Кажуць, што калісьці пад ім схоў быў і ў ім людзі ратаваліся ад наездаў асманаў, — успомніў хлопец. — Вось бы цяпер гэтыя басурманы з'явіліся тут! От, галовы мы б ім пасеклі! За ўсіх нашых пабітых і загнаных у няволю людзей адказалі б!»

Раптам на дарозе ля Абярэг-дубу нешта заварушылася і перапыніла хлапечыя летуценні. Дамінік выцер з твару слёзы і пачаў прыглядацца.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 17 сакавіка 2007. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 288–23–52.

ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

АДРАС: 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214. Тэл.: +375 29 651 21 12. Пасведчанне №46 ад 12.01.2007 г.

НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутос-Маркет». Мінск, вул. Кульман, 1.

Замова №

Падпісана да друку 27.04.2007. 8.00.
Наклад 2500 асобнікаў.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.